**І. В. Казакова**

Кафедра тэорыі літаратуры, філалагічны факультэт,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

УДК 373.035:398.21+398.21(=161.3)

# ЗНАЧЭННЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТВОРАЎ У ПРАЦЭСЕ АДУКАЦЫІ І ВЫХАВАННЯ

У артыкуле разглядаецца роля фальклорнай спадчыны ў працэсе дашкольнай і школьнай адукацыі і выхавання. Акцэнтуецца ўвага на значэнні беларускіх народных казак у кантэксце фарміравання здаровага пазітыўнага светапогляду дзяцей і юнацтва, у пабудаванні гарманічнай іерархіі сапраўдных каштоўнасцей.

**Ключавыя словы:** фальклорная спадчына, значэнне фальклору ў працэсе выхавання і адукацыі, беларускія народныя казкі, казкі пра жывёл, сучаснасць сюжэтаў народных казак.

**Узор цытавання:** *Казакова І. В.* Значэнне фальклорных твораў у працэсе адукацыі і выхавання // София. 2017. № 1. С. 8–13.

**I. Kazakova**

Department of Theory of Literature, Philological Faculty,
Belarusian State University, Minsk, Belarus

# THE VALUE OF FOLKLORE IN THE PROCESS OF EDUCATION AND UPBRINGING



The article deals with the role of folklore heritage in the process of pre-school and school education and upbringing. The emphasis is on the value of the Belarusian folk tales for the formation of a healthy positive outlook and harmonious hierarchy of human values of children and young people.

**Keywords:** folk heritage, folklore value in the process of upbringing and education, the Belarusian folk tales, fairy tales about animals, modern adaptation of folk tales.

**For citation:** Kazakova, I. (2017). The value of folklore in the process of education and upbringing. *Sophia*, 1, 8–13 (in Belar.).

**Аўтар:**
**Ірына Валер'еўна Казакова** – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.
irina_sml@bk.ru.

**Author:**
**Irina Kazakova** – Doctor of Philology, Professor of the Department of Theory of Literature of the Philological Faculty, BSU.

Вывучэнне беларускай фальклорнай спадчыны і выкарыстанне яе ў працэсе адукацыі і выхавання адыгрывае значную ролю ў патрыятычным, ідэалагічным і культурным аспекце, развівае пачуццё грамадскай свядомасці і свядомасці нацыянальнай. У любой этнакультуры гістарычна закладзены разнастайныя мадэлі пазітыўнай адаптацыі асобы, якія існуюць у якасці дзейсных механізмаў пры арганізацыі неабходных умоў сацыякультультурнай адукацыйнай дзейнасці.

Выдатны даследчык беларускай культуры У. М. Конан адзначаў: «На пачатку было слова… З такой жа ўпэўненасцю можна было б сказаць і пра фальклор, што ён быў на пачатку мастацкай культуры чалавецтва. А пачатак, як вядома, уваходзіць і ў завяршэнне. Бо такі пачатак – гэта аснова, той краевугольны камень, на якім трымаецца храм людской духоўнасці» [4, с. 27]. І гэта сапраўды так. Фальклор быў, бясспрэчна, гістарычна першай формай выяўлення народнай свядомасці і чалавечай духоўнасці наогул. Глыбокае і ўсебаковае вывучэнне фальклору – найпершага і найглыбейшага самавыяўлення народнай душы – дае магчымасць сучаснаму чалавеку выратавацца ад бездухоўнасці, не страціць сувязь з Космасам, з Прыродай, з касмічнымі рытмамі; развіваць у сябе і сваіх дзяцей добры эстэтычны густ, выхоўваць лепшыя чалавечыя якасці і пачуцці.

Усё пачынаецца са слова. Гэта так. Але найбольш значным з'яўляецца тое, што пачынаецца з самага першага слова, якое гучыць у сям'і і школе. Сям'я і школа – пачатак для асобы. Фальклор – пачатак духоўнай культуры народа. І пра гэта нельга забываць і ў наш час, час высокіх навуковых тэхналогій і камп'ютараў. Кожны народ, як бы ні змянялася яго жыццё, застаецца самім сабой. Асноўныя этнічныя асаблівасці, спецыфіка нацыянальнага светапогляду і псіхалогіі захоўваюцца на этапах развіцця.

Беларуская народная творчасць заўсёды несла ў сабе пазітыўны, аптымістычны, здаровы пачатак. Фальклорныя творы вучылі любові да радзімы, у прыватнасці, да малой радзімы, да таго месца, дзе чалавек упершыню ўбачыў свет, вучылі любові да роднага слова, вучылі шанаваць бацькоў і Бацькаўшчыну. У фальклорных творах заўсёды ўхваляліся лепшыя чалавечыя якасці: працавітасць, дабрыня, сціпласць, жаданне дапамагаць людзям, уменне любіць і ахвяраваць сабой дзеля высакароднай мэты, захапленне прыгажосцю прыроды, імкненне зрабіць свой край яшчэ больш прыгожым і шчаслівым. Народ заўсёды асуджаў гультайства, п'янства, скважнасць, хцівасць, злосць, жорсткасць, зайздрасць, глупства, нежаданне вучыцца новаму, залішнюю ганарлівасць, непаважлівае стаўленне да іншых людзей.

Шаноўнае стаўленне да зямлі-карміцелькі, разуменне зямлі як агульнага чалавечага дома, імкненне не рабіць зло – усё гэта закладзена ў лепшых творах вусна-паэтычнай спадчыны нашага народа. Працэс асэнсавання выхаваўчага патэнцыялу фальклору пачаўся яшчэ ў XIX ст. Але ў наш час, калі ў грамадстве запанавалі СМІ, грошы і бездухоўнасць, на выкрышталізаваныя народам ідэалы амаль не звяртаюць увагу. Фальклорная спадчына – гэта не толькі высокае мастацтва народнага слова, якое мае значную эстэтычную каштоўнасць, але і энцыклапедыя пазнання жыцця, выхавання чалавека. А выхаванне дзяцей і моладзі – адна з найважнейшых задач любога грамадства. Фальклор – гэта ідэальны падмурак выхавання лепшых якасцей сучаснай асобы.

Вельмі важным з'яўляецца і глыбокае веданне фальклору выхавацелямі дашкольных устаноў і выкладанне фальклору ў школе. На жаль, у нашай краіне няма такога асобнага прадмета ў школьнай праграме. Пэўную частку ведаў пра фальклор вучні атрымліваюць толькі на ўроках беларускай літаратуры і пазакласных занятках. Але настаўнікі літаратуры абмежаваныя зусім невялікай колькасцю гадзін на вывучэнне тэмы фальклору і вялікім аб'ёмам матэрыялу. Ёсць праблемы ў адборы матэрыялу на ўрок і арганізацыі самога ўрока. На вялікі жаль, не заўсёды настаўнік мовы і літаратуры з'яўляецца добра падрыхтаваным філолагам з глыбокім веданнем фальклорнай асновы сваёй роднай культуры. Падрыхтоўка кваліфікаваных маладых кадраў

для працы ў дашкольных установах і ў школе – важная і адказная задача сучаснасці. Вырашэнне гэтай задачы складаецца са шматлікіх кампанентаў. Так, адной з найважнейшых задач вышэйшай школы на сучасным этапе з'яўляецца павышэнне якасці адукацыі і ўдасканаленне вучэбнага працэсу. Гэта патрабуе перагляду традыцыйных стратэгій навучання, пошук новых рэзерваў у выкладанні такога важнага ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі філолагаў прадмета як фальклор.

Фальклор адыгрываў і адыгрывае значную ролю ў духоўным жыцці нашага народа, з'яўляецца скарбонкай усіх асноўных каштоўнасцей, аднаўляе сувязь часоў, замацоўвае традыцыі, дапамагае выхаванню дасканалага ва ўсіх адносінах да чалавека. У беларускай народнай творчасці заўсёды прысутнічала захапленне эстэтыкай дзяцінства. Наш народ стварыў для дзяцей цудоўныя творы: казкі, калыханкі і інш.

Беларусы вельмі цэльныя натуры. Сіплыя, гасціныя, памяркоўныя, талерантныя, сумленныя, добразычлівыя, вельмі добрыя бацькі. Цудоўная сісэма выхавання дзяцей выкладзена ў адной толькі беларускай прыказцы: «Да пяці год пестуй дзіця як яечка, з сямі – пасі як авечку: тады выйдзе чалавечка». Беларускі погляд на выхаванне вельмі падобны на ўсходнюю думу пра тое, што дрэнных дзяцей не бывае, дзеці ёсць толькі добрыя і вельмі добрыя.

Прынцып «навучаць забаўляючы» вельмі добра рэалізаваны ў фальклорных творах. Варта было б узяць яго на ўзбраенне і сучасным выхавацелям і настаўнікам малодшых класаў. І тут на дапамогу, безумоўна, прыходзяць народныя казкі. Казкі выхоўваюць нас і ў дзяцінстве, і на працягу ўсяго жыцця. Казка прымушае задумацца, наводзіць на разважанне, падказвае чалавеку шлях. Мары чалавека аб лепшым жыцці, надзеі на цуд, вера ў бязмежнасць магчымасцей чалавека адлюстравалі, напрыклад, чарадзейныя казкі, адны з самых старажытных фальклорных твораў. Паводле акадэміка В. А. Каваленкі, «ніводны фальклорны жанр не валодае такой бязмежнай здольнасцю паэтызацыі, як казка, асабліва чарадзейная» [2, с. 88].

Многія сучасныя маладыя людзі схільныя да дэпрэсіўнага настрою. Казка ж усяляе ў чалавека аптымізм, сцвярджае веру ў дабро і розум. Асабліва гэтым вылучаюцца казкі пра жывёл (увогуле амаль усе мастацкія творы, дзе дзейнічаюць жывёлы). Казкі пра жывёл – своеасаблівая разнавіднасць казачнага жанру. Яны з глыбокай старажытнасці адлюстроўвалі назіранні за жывёламі спачатку паляўнічых, а потым – жывёлаводаў, перадавалі дзецям жыццёвы досвед і веды пра жывёльны свет. Пазней за вобразамі жывёл сталі прасочвацца сацыяльныя адносіны паміж людзьмі, ухваленне высакародных якасцей, выкрыванне заганаў і г.д. Даследчык М. А. Янкоўскі заўважаў: «Народная казка пра жывёл вырасла з сацыяльнага і духоўна-практычнага вопыту працоўнага чалавека-селяніна. Карані яе фантазіі знаходзяцца ў вясковым быце з усімі яго жыццёвымі рэаліямі» [5, с. 225].

Галоўнымі персанажамі такіх казак выступаюць розныя жывёлы і птушкі, што само па сабе ўжо выклікае ў дзяцей цікавасць. Жывёлы гавораць і дзейнічаюць як людзі. Такія казкі дапамагаюць дзецям пазнаваць навакольны свет, адрозніваць добрае і дрэннае, суперажываць, пазбаўляцца ад дрэнных якасцей. Выдатны даследчык беларускіх народных казак К. П. Кабашнікаў адзначаў: «Характэрнай асаблівасцю вобразаў казак аб жывёлах трэба лічыць замацаванне за імі ў вуснай традыцыі пэўных якасцей, якія пераходзяць з казкі ў казку, з сюжэта ў сюжэт. Амаль ва ўсіх казках ліса малюецца хітрай, воўк – дурным, заяц – баязліўцам, кот – мудрым. У тых выпадках, калі, напрыклад, хітрасць сутыкаецца з мудрасцю, развіццё падзей патрабуе нестандартнага

вырашэння, і тая ж хітрая ліса (якая ў другіх сюжэтах падманвае воўка-дурня) аказваецца пераможнай і ашуканай» [1, с. 108–109].

Папулярнымі казкамі сталі творы з персанажамі лясных звяроў – мядзведзя, льва, ваўка, лісы, зайца, дзіка; хатніх жывёл – каня, барана, ката, свінні, сабакі і інш.; птушак. Кожны з персанажаў надзяляецца адпаведнымі рысамі. У шэрагу, як ужо адзначалася вышэй, казак надзвычайнай хітрасцю вылучаецца лісіца; яна абхітрue рыбалова – прыкідваецца мёртвай, а калі ён кінуў яе на воз, выкідвае рыбу, а потым ашуквае ваўка, у выніку чаго прымярзае яго хвост у палонцы, якім ён «ловіць рыбу», абрывае хвост, уцякаючы ад людзей; верыць лісіцы, што тая есць свае мазгі і забіваецца насмерць аб сцяну галавой [3, с. 38–39]. У другой казцы лісіца здолела абхітрыць ваўка, мядзведзя, дзятла і выбілася з бяды [3, с. 42–43]. Каб абхітрыць мядзведзя і падвесці яго да пасткі, ліса крывадушна прыкідваецца веруючай. На словах спачувае галоднаму мядзведзю, паказвае яму мяса ў пастцы, сама ж запэўнівае яго, што яна каталічка, і ў сераду посціць. Калі ж мядзведзь трапіў у пастку і яго падняла ўгару, яна пачала есці мяса. У камічным дыялогу паміж імі раскрываецца крывадушнасць і здрадніцтва лісы. Мядзведзь гаворыць ёй:

– Кумка-галубка, табе ж серада!
– Э, кумок-галубок, няхай той серадзіць, хто ўгару глядзіць! [3, с. 46].

У казках пра жывёл не заўсёды вытрымліваецца іерархія: часцей за ўсё не мацнейшы звер перамагае слабейшага, а наадварот. Больш за таго, калі ліса захапіла хатку зайца, яе адтуль не мог выгнаць ні мядзведзь, ні воўк, а певень [3, с. 43–51]: птушка, з якой у рэчаіснасці яна вельмі лёгка спраўляецца і нярэдка ўжывае ў ежу.

У некаторых казках лісу перамагае мудры кот і нават «дурная» варона, якая трапіла ў яе лапы і папрасіла яе не рабіць так як яе маці: «возьме два рэшаты, зложыць адно к аднаму, усадзіць» яе «і з гары як пачнець катаць, дык ні костачкі, ні пярынкі! – усё разляціцца». Калі ж ліса менавіта так і зрабіла, «рэшаты разляцеліся, а варона палящела…» [3, с. 55–56].

У беларускіх казках пра жывёл дзеючымі асобамі з'яўляюцца звычайна тыя звяры, хатнія жывёлы, птушкі, якія жывуць на тэрыторыі краіны. Але ёсць і такія беларускія казкі, у якіх галоўным персанажам паўстае леў. Напрыклад, у казцы «Як конь стаў старшы за льва» леў патрабуе да сябе павагі ад каня: «А ты, стары харлаку! То ж я леў, чаму ты мне паклону не аддаеш?».

Конь апраўдваецца, называе льва найяснейшым кролем. Аднак у спрэчцы конь перахітрае льва, вымушае прызнаць, што ён дужэйшы: падковай выбівае іскры, леў жа лапамі не здолеў зрабіць гэтага. Вымушаны быў леў сказаць ваўку, што конь ад яго каралеўства адабраў. Цікава, што і ў гэтай казцы, і ў другой – «Леў і воўк» – леў пры спробе паказаць каня ваўку хапае яго так, што душыць насмерць, але лічыць прычынай гібелі ваўка смяротны спалох пры адным толькі поглядзе на каня («Эх, ты, хвалько: толькі ўбачыў яго і то ўжо самлеў. А я прабаваў з ім сілу, – кажа леў» [3, с. 115–116]). Разам з тым, казак пра льва ў беларускім фальклоры няшмат, што абумоўлена адсутнасцю гэтага звера ў сапраўднасці. У адной казцы нават апавядаецца, чаму ў нас няма львоў: чалавек пачаставаў льва цэлым цэбрам хмелю (з мёдам і гарэлкай), пасля паздзіраў скуру на нагах па калені. Калі леў «выцверазіўся», пабег «да таго краю, дзе хмелю няма» (казка «Чаму леў уцёк з нашай стараны» [3, с. 117–118]).

Другі па папулярнасці персанаж пасля лісы ў беларускіх казках пра жывёл – воўк. Галоўныя рысы яго: ненажэрнасць, прагнасць, спрытнасць пры нападзе на ахвяру,

дурасць. У некаторых казках воўк звяртаецца да Бога з просьбай наталіць яго голад. Бог дае дазвол з’есці плотачку, акуня і інш. Ён жа з’ядае каня, карову, кабылу з жарабём і застаецца галодным (казка «Галодны воўк» [3. с. 120–121]). Амаль у кожнай казцы пра ваўка выяўляецца яго дурасць. Адна казка так і называецца «Дурны воўк» [5, с. 123–125]. У ёй воўк скардзіцца святому Ягор’ю: «Госпадзі! Я хачу есці!». Ягор’я дазваляе з’есці гусей, але гусі ашукалі ваўка і паляцелі. Дазваляе Ягор’я з’есці свінню, але свіння абхітрue ваўка. Нават баран, пра якога існуе прыдумка «дурны, як баран», – і той абдурвае яго: прапануе стаць у лагчыне, разявіць рот, і ён сам ускочыць у рот. Баран так даў ваўку ў лоб, што той перавярнуўся, а баран уцёк. Яшчэ большая дурасць праяўляецца ў воўка пры канфлікце з чалавекам.

Увогуле ж усе жывёлы, птушкі і нават насякомыя надзяляюцца ў казках здольнасцю гаварыць па-чалавечы, паводзіць сябе як людзі. Па сутнасці, праз паказ жыцця і канфліктаў у асяроддзі жывёл адлюстроўваюцца адносіны ў грамадстве: асуджаецца крыважэрнасць, лютасць, зло, несправядлівасць, ашуканства, прагнасць і іншыя заганы.

Пры адсутнасці ў Беларусі цара звяроў льва, у казках над звярамі пануе мядзведзь як самы дужы, але не самы разумны, як відаць з прыведзенай вышэй казкі. У шэрагу казак («Ліска і кот», «Кот, лісіца, воўк», «Як коцік велькія звяры папалохаў», «Кот, лісіца і звяр’ё», «Кот-лавун» [3, с. 96–102]) мядзведзь палохаецца ката (дарэчы, кот – адзін з самых папулярных персанажаў з хатніх жывёл): яго мяўканне («мяў-мяў») успрымаецца ім як «мала» (мядзведзь гаворыць, гледзячы як кот есць мяса і мяўкае: «Іш, сам малы, а есць пабагату»).

З птушак персанажамі казак з’яўляюцца варона, крумкач, дзяцел, дрозд, сарока, сокал, певень, курка і інш. Царом усіх птушак у казцы «Пціцы на Русі» выступае арол. Да яго птушкі звяртаюцца з вялікай пашанай, называюць яго бацюшкам-царом. Арол сядзіць на сасне і слухае скаргі, просьбы, кагосьці мілуе, каго карае, камусьці дваранскае званне дае. Для прыкладу прывядзём урывак дыялогу з казкі. Варона падала скаргу на вераб’я:

– Бацюшка цар-арол. Рассудзі мяне з вераб’ём: ізбіў ён мяне, дыханне закладаець!
Арол весьма асярчаў, крыкнуў громка:
– Верабей, падзі сюды!
Верабей падбяжаў прама і картуз скінуў і гаворыць:
– Чаго ізволіце, цар-арол?
Гаворыць арол:
– Ты за што, брацце, варону ізбіў і іскалечыў, што яе дыханне закладаець?
Верабей гаворыць:
– Бацюшка цар-арол, як яе не біць і яе, дуру, не калаціць?
І доўга тлумачыць, што варона перашкаджае селяніну працаваць [3, с. 219].

Не заўсёды казкі пра жывёл маюць шчаслівую развязку, не заўсёды ў іх дабро перамагае зло. Такія казкі вядуць да роздуму. Напрыклад, у казцы «Дзедава рукавічка» (сюжэт яе падобны на сюжэт рускай казкі «Теремок»), жывёлы, што разам пасяліліся ў рукавіцы, пакутуюць ад мядзведзя, які ўзлез на іх жытло і знішчыў яго. У адных варыянтах казкі жывёлы разбягаюцца, у другіх – загінулі. Казка не паэтызуе сілу (якая без розуму), не ўхваляе дзеянні яе носьбіта. Наадварот, казка выклікае спачуванне да пакрыўджаных жыхароў рукавічкі, казка асуджае ўчынак мядзведзя. У параўнанні з добрымі і гасціннымі насельнікамі дзедавай рукавічкі, мядзведзь выступае як злосны агрэсар. Сюжэт казкі вядзе сваё паходжанне з глыбокай старажытнасці. Але, на нашу думку, ён мае вельмі сучасны сэнс. Гэту казку, напрыклад, можна разыграць у выглядзе тэатральнай пастаноўкі ў дзіцячым садку альбо ў школьным

самадзейным гуртку ў якасці нагляднага прыкладу жудасных наступстваў бязлітаснай агрэсіі і тэрарызму.

Берагчы жыццё, не пасягаць на чужы Дом (у шырокім сэнсе), паважаць іншых, быць добрым і шчырым і г.д. – вось чаму вучыць казка.

Далучэнне да скарбаў народнай культуры будзе садзейнічаць фарміраванню правільнага, здаровага светапогляду дзяцей і юнакоў, дапаможа выхаванню эстэтычнага густу, сфарміруе гарманічную іерархію сапраўдных каштоўнасцей.

## Літаратура

1. *Кабашнікаў, К. П.* Казкі аб жывёлах // Народная проза / К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. В. Цітавец ; навук. рэд. А. С. Ліс. – Мінск, 2002. – С. 90–165. – (Беларускі фальклор : жанры, віды, паэтыка / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы ; Кн. 4).

2. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка ; рэд. І. Я. Навуменка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 318 с.

3. Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / склад. К. П. Кабашнікаў ; рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 495 с.

4. *Конан, У. М.* Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. М. Конан. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 238 с.

5. *Янкоўскі, М. А.* Паэтыка беларускай народнай прозы / М. А. Янкоўскі ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Выш. шк., 1983. – 268 с.